М.П.КАХНО, дацэнт
/Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт/

# ЭКАНАМІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ І ТЭХНАЛОГІЯ ВЫТВОРЧАСЦІ

Для існавання і развіцця кожнага чалавека і грамадства увогуле патрэбны тавары і паслугі. Так як у сваёй большасці яны не з'яўляюцца натуральным прыродным шляхам, грамадства павінна іх вырабляць. Менавіта для гэтага існуюць вытворчыя сістэмы /заводы, прадпрыемствы і г.д./. У рамках вытворчых сістэм ажыццяўляюцца вытворчыя працэсы.

Як вядома, функцыя, якую выконвае кожны аб'ект, адлюстроўвае сутнасць існавання гэтага аб'екта. Функцыя вытворчага працэса -- вытворчасць таго ці іншага тавара. Па функцыі, якую выконвае вытворчы працэс, ён падзяляецца на два элементы. Першы з іх уключае дзеянні па непасрэдным вырабе тавараў -- тэхналогія вытворчасці; другі -- дзеянні, якія неабходны для ажыццяўлення тэхналогіі /забеспячэнне, улік, кантроль, кіраванне і г.д./ -- эканоміка вытворчасці.

Відавочна, што асноўным звяном вытворчага працэсу з'яўляецца тэхналогія, у ёй знаходзіцца крыніца неабмежаванага росту прадукцыйнасці працы. І, нягледзячы на тое, што у адміністрацыйным плане эканоміка бясспрэчна выконвае галоўную ролю, яна павінна ясна усведамляць, што менавіта тэхналогія -- аснова росквіту вытворчасці. Адносіны і сувязі паміж эканомікай і тэхналогіяй вытворчасці такія ж, як паміж, напрыклад, пладовым дрэвам і садоўнікам. Каб забяспечыць вялікі ураджай, садоўнік павінен добра вывучыць расліну і рабіць толькі тое, што пойдзе ёй на карысць. Адпаведна для павелічэння вынікаў вытворчасці эканоміка павінна добра вывучыць тэхналогію, якой кіруе, і рабіць усё для яе развіцця і росту. Без вывучэння тэхналогіі вытворчасці нельга гаварыць аб магчымым дасягненні добрых вынікаў.

У свеце ёсць краіны, якія убачылі ролю тэхналогіі у развіцці грамадства. У гэтым сэнсе яскравым прыкладам з'яўляецца Японія, дзе развіццё тэхналогіі забяспечыла такія эканамічныя паказчыкі, якія у шэрагу выпадкаў пераўзыходзяць адпаведныя паказчыкі пакуль што самай магутнай у свеце дзяржавы -- ЗША.

З улікам усяго сказанага трэба карэнным чынам змяніць адносіны да курса тэхналогіі у эканамічнай навучальнай установе. Тэхналогія павінна стаць адной з асноўных дысцыплін пры падрыхтоўцы

эканамістаў і кіраўнікоў вытворчасці. Без ведаў заканамернасцяў тэхналогіі ў прынцыпе немагчыма навукова обгрунтаванае кіраўніцтва і абслугоўванне тэхналагічнага працэсу.

М.У.САМОЙЛАЎ, дацэнт
/Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт/

АБ ВЫКАРЫСТАННІ ТЭОРЫІ РАШЭННЯ ВЫНАХОДНІЦКІХ ЗАДАЧ ПРЫ ТЭХНАЛАГІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ ЭКАНАМІСТАЎ

У навучанні эканамістаў, якія рыхтуюцца для працы на прамысловых прадпрыемствах, вялікую ролю адыгрываюць веды ў галіне тэхнікі і тэхналогіі. Гэтае патрабаванне абумоўлена тым, што эканамісту патрэбна не толькі умець хутка арыентавацца ў складаных умовах сучаснай вытворчасці, але і умець яе ацэньваць, аналізаваць, вызначаць асноўныя напрамкі развіцця. А гэта магчыма толькі тады, калі дасканала ведаеш аб'ектыўныя заканамернасці функцыяніравання і развіцця прамысловай вытворчасці, асновай якой з'яўляецца тэхналогія і тэхніка, рэалізаваныя ў канкрэтных сістэмах рознага іерархічнага узроўню.

Метадалогія тэорыі рашэння вынаходніцкіх задач /ТРВЗ/ з'яўляецца дзейным інструментам у фарміраванні тэхналагічнага мыслення ў будучых эканамістаў, якое дазваляе аб'ектыўна і навукова падыходзіць да аналіза функцыяніравання і развіцця складаных тэхнічных і тэхналагічных сістэм. Сапраўды, адпаведна ТРВЗ такія сістэмы функцыяніруюць і развіваюцца па аб'ектыўна існуючых законах, якія даступны пазнанню, іх магчыма высветліць і, самае галоўнае, выкарыстоўваць для свядомага і мэтанакіраванага удасканальвання матэрыяльнай вытворчасці.

У дысцыпліне "Сучасныя тэхналогіі", якая чытаецца для эканамістаў, не толькі выкладаюцца звесткі аб ТРВЗ, яе асноўных пастулатах, але і выкарыстоўваюцца яе падыходы як пры аналізе канкрэтных тэхналагічных сістэм, вытворчых сітуацый, так і на працягу лекцыйнага выкладання самой дысцыпліны, яе прапрацоўкі пры правядзенні лабараторных, практычных заняткаў, самастойнай працы студэнтаў. Вывучэнне курса "Сучасныя тэхналогіі" з дапамогай ВЗ дазваляе ў вялікай ступені пазбегнуць засваення студэнтамі адрывачных, бессістэмных ведаў аб найгалоўнейшых тэхналогіях прамысловай вытворчасці, спрыяе цэласнаму успрыманню аб'ектыўна існую-